УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# М а т э р ы я л ы

**першага (школьнага) этапу Рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах**
**“беларуская мова” і “беларуская літаратура”**
**для вучняў XI класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2017/2018 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2017

# Водгук на мастацкі твор

## XI клас

Пімен Панчанка

***

Жнівеньская ноч як звар’яцела,
Развязала чорныя мяхі.
Сотні тысяч зорак пераспелых
Сыплюцца на мокрыя імхі.

Галаву і сэрца мне працяла
Млечным Шляхам.
Край сасновы мой
Сёння ноччу нейкім стаў працягам
Зорнай таямніцы векавой.

Балбатня пра атамы – пустое,
Бо ў  прыгажосці – свой закон.
Толькі гэта неба залатое
Назаўжды ўзяло мяне ў палон.

Загадайце, хлопцы і дзяўчаты,
Спраўдзіцца ўсё ў жыцці ў вас...
Зоркі, не пагасніце дачасна,
Я люблю вас,
Я кахаю вас.

1977

**I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**XI клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | **50** |

**Заданне 1.** Запішыце фанетычную транскрыпцыю слоў.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**; 0,5 б. за кожны правільны запіс)*

| Словы | Фанетычная транскрыпцыя | Словы | Фанетычная транскрыпцыя |
|---|---|---|---|
| не мог | | без кніг | |
| суперігра | | пенсія | |
| едзьце | | сведчыць | |
| нясвіжскі | | гадуешся | |

**Заданне 2.** З прапанаваных пар утварыце складаныя словы.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**; 0,5 б. за кожнае правільна запісанае слова)*

| Словы | Назоўнік | Словы | Прыметнік |
|---|---|---|---|
| радый + нукліды | | мёд + насіць | |
| вада + качаць | | агонь + тушыць | |
| уборка + зерне | | вялікі + галава | |
| радый + хімія | | сто + метр | |

**Заданне 3.** Да прыведзеных слоў злева падбярыце адпаведныя сінонімы з правага слупка.

*(Максімальная колькасць балаў – **6**; 0,5 б. за правільна падабраны сінонім)*

| | |
|---|---|
| 1) прывід | а) інтэграцыя |
| 2) раўназначны | б) чыннік |
| 3) заняпад | в) кампетэнтны |
| 4) аб’яднанне | г) фальсіфікацыя |
| 5) дасведчаны | д) прэамбула |
| 6) пераважаць | е) прэваліраваць |
| 7) вандроўнік | ё) дэфініцыя |

| | |
|---|---|
| 8) азначэнне | ж) фантом |
| 9) уступ | з) ідэнтычны |
| 10) падробка | і) дэкаданс |
| 11) фактар | к) аўтадыдакт |
| 12) самавучка | л) пілігрым |

**Адказ:** 1___ 2___ 3___ 4___ 5___ 6___ 7___ 8___ 9___ 10___ 11___ 12___

**Заданне 4.** Размяркуйце назоўнікі паводле іх ужывання толькі ў форме множнага ліку або ў форме адзіночнага і множнага ліку.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**;*
*0,5 б. за правільна размеркаванае слова)*

Каноплі, буцы, гуслі, кансервы, жабры, туфлі, каардынаты, абцугі, карункі, лейцы.

| Множналікавыя словы | Словы, якія маюць формы адзіночнага і множнага ліку |
|---|---|
| | |

**Заданне 5.** Выпішыце нумары толькі тых слоў, якія адрозніваюцца лексічным значэннем. Як называюцца такія словы?

*(Максімальная колькасць балаў – **3**;*
*0,5 б. за правільна выпісаныя словы; 1 б. за назву)*

1) пасланнік і пасланец;

2) галец і галіць;

3) гушчар і гушчарнік;

4) вуж і вужака;

5) задзірлівы і задзірысты;

6) маляр і муляр;

7) абанент і абанемент.

Нумары слоў: __________________

Гэтыя словы называюцца ______________________

**Заданне 6.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*(Максімальная колькасць балаў – **12**)*

На другой день рано утром Марья Ивановна проснулась, оделась и тихонько пошла в сад. Утро было прекрасное, солнце освещало вершины лип, пожелтевших уже под свежим дыханием осени. Широкое озеро сияло неподвижно. Проснувшиеся лебеди важно выплывали из-под кустов, осеняющих берег… Вдруг белая собачка английской породы залаяла и побежала навстречу. Марья Ивановна испугалась и остановилась. В эту самую минуту раздался приятный женский голос: «Не бойтесь, она не укусит» (А.С. Пушкин. «Капитанская дочка»).

**Заданне 7.** Расстаўце знакі прыпынку ў сказах. Нумар сказа з адасобленым членам упішыце ў тую графу табліцы, што называе від гэтага адасобленага члена сказа.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**;*
*2 б. за правільнае размеркаванне;*
*0,2 б. за правільна пастаўлены знак прыпынку)*

1. На ганку маці выйшаўшы стаіць і ўдаль куды паехаў сын глядзіць.

2. Абвітыя хмелем галінкі і лісце спляталіся над галавою так густа што праз іх не магло прабіцца сонца.

3. Светлыя хмаркі дзеткі прастору ціха па небе плывуць.

4. У садзе апрача розных гатункаў яблынь растуць вішні і слівы.

| Адасобленыя члены сказа | | | |
|---|---|---|---|
| азначэнне | прыдатак | дапаўненне | акалічнасць |
| | | | |

**Заданне 8.** Назавіце мастакоў слова, якім адпавядаюць наступныя выразы. Як такія выразы называюцца?

*(Максімальная колькасць балаў – **7**)*

| Выразы | Мастак слова |
|---|---|
| а) атаман мужыцкай праўды | |
| б) сялянскі адвакат | |
| в) стваральнік энцыклапедыі сялянскага жыцця | |
| г) пясняр заходнебеларускіх барыкад | |
| д) паэт – прарок нацыянальнага Адраджэння | |
| е) пясняр чыстай красы | |

Гэтыя выразы называюцца ______________________

**Заданне 9.** Як называецца твор, поўная назва якога ў арыгінале гучыць так: “Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis”? Хто яго аўтар? Дзе і калі быў напісаны гэты твор?

*(Максімальная колькасць балаў – **2**;*
*0,5 б. за кожны правільны адказ)*

Назва: ________________________________

Аўтар: ________________________________

Месца напісання: ________________________________

Год напісання: ________________________________

**Заданне 10.** Адзначце нумары правільных азначэнняў.

*(Максімальная колькасць балаў – **3**)*

1. Гіпербала – іншасказанне, адна з форм мастацкага адлюстравання жыцця, калі абстрактнае паняцце або думка перадаюцца праз канкрэтны вобраз.

2. Троп – слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні.

3. Харэй – двухскладовая стапа, у якой націск падае на другі склад.

4. Жыціе – апісанне падарожжа ў Святую Зямлю.

5. Да эпічных жанраў адносяцца раман, аповесць, апавяданне, навела, нарыс, фельетон.

6. Алітарацыя – паўтарэнне ў вершаванай мове аднолькавых або падобных галосных гукаў.

7. Кульмінацыя – гэта вяршыня ў развіцці дзеяння, найвышэйшы момант яго напружання.

**Адказ: ________________**

УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# Д а в е д к і

**першага (школьнага) этапу Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па вучэбных прадметах</u>**
**<u>“беларуская мова” і “беларуская літаратура”</u>**
**для вучняў XI класа агульнаадукацыйных устаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2017/2018 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2017

**І (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**ХІ клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

## ДАВЕДКІ

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **4** | **4** | **6** | **5** | **3** | **12** | **4** | **7** | **2** | **3** | **50** |

**Пры выкананні заданняў за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

### Заданне 1

| | | | |
|---|---|---|---|
| не мог | [н’а мо́х] | без кніг | [б’ас кн’і́х] |
| суперігра | [су́п’эрыгра́] | пенсія | [п’э́нс’ійа] |
| едзьце | [йэ́ц’ц’э], [йэ́ц̄’э] | сведчыць | [с’в’э́ччыц’], [с’в’э́ч̄ыц’] |
| нясвіжскі | [н’ас’в’і́ск’і], [н’ас’в’і́шск’і] | гадуешся | [гаду́йэс’с’а], [гаду́йэс̄’а] |

### Заданне 2

| | | | |
|---|---|---|---|
| радый + нукліды | радыенукліды | мёд + насіць | меданосны |
| вада + качаць | вадакачка | агонь + тушыць | вогнетушыльны |
| уборка + зерне | зернеўборка | вялікі + галава | вялікагаловы |
| радый + хімія | радыяхімія | сто + метр | стаметровы |

### Заданне 3

**Адказ:** 1_ж_ 2_з_ 3_і_ 4_а_ 5_в_ 6_е_ 7_л_ 8_ё_ 9_д_ 10_г_ 11_б_ 12_к_

### Заданне 4

| Множналікавыя словы | Словы, якія маюць формы адзіночнага і множнага ліку |
|---|---|
| каноплі<br>карункі<br>гуслі<br>кансервы<br>абцугі | буцы<br>жабры<br>туфлі<br>каардынаты<br>лейцы |

**Заданне 5**

Нумары слоў: **2, 4, 6, 7**

Гэтыя словы называюцца **паронімы**.

**Заданне 6**

На другі дзень раніцай (на світанні) Мар'я Іванаўна прачнулася, апранулася і ціхенька пайшла ў сад. Раніца была цудоўная, сонца асвятляла вяршыні (верхавіны) ліп, пажаўцелых пад свежым дыханнем (подыхам) восені. Шырокае возера ззяла непарушна (нерухома). Прачнуўшыся, лебедзі важна выплывалі з-пад кустоў, якія абступілі бераг… Раптам белы сабачка англійскай пароды забрахаў і пабег насустрач. Мар'я Іванаўна спалохалася і спынілася. У гэту самую хвіліну пачуўся прыемны жаночы голас: "Не бойцеся, яна не ўкусіць" (А.С. Пушкін. "Капітанская дачка").

**Заданне 7**

1. На ганку маці, выйшаўшы, стаіць і ўдаль, куды паехаў сын, глядзіць. (М.Танк)
2. Абвітыя хмелем, галінкі і лісце спляталіся над галавою так густа, што праз іх не магло прабіцца сонца. (Б.Сачанка)
3. Светлыя хмаркі, дзеткі прастору, ціха па небе плывуць. (Я.Колас)
4. У садзе, апрача розных гатункаў яблынь, растуць вішні і слівы.

| Адасобленыя члены сказа | | | |
|---|---|---|---|
| азначэнне | прыдатак | дапаўненне | акалічнасць |
| 2 | 3 | 4 | 1 |

**Заданне 8**

| | |
|---|---|
| а) атаман мужыцкай праўды | Кастусь Каліноўскі |
| б) сялянскі адвакат | Францішак Багушэвіч |
| в) стваральнік энцыклапедыі сялянскага жыцця | Якуб Колас |
| г) пясняр заходнебеларускіх барыкад | Максім Танк |
| д) паэт – прарок нацыянальнага Адраджэння | Янка Купала |
| е) пясняр чыстай красы | Максім Багдановіч |

Гэтыя выразы называюцца **перыфразы.**

**Заданне 9**

Назва: "Песня пра зубра"

Аўтар: Мікола Гусоўскі

Месца напісання: Рым

Год напісання: 1522

**Заданне 10**

Адказ: **2, 5, 7**